## § 9. Публіцыстычны стыль, яго жанры, сфера выкарыстання

**48.** Выразна прачытайце тэкст. Для каго і з якой мэтай ён напісаны?

У свеце існуюць тысячы прафесій. Вы можаце выбраць любую з іх, але памятайце, што любая прафесія — гэта праца. Ваша праца — гэта вучоба.

Вельмі важна, каб кожны выбраў сабе справу па душы. Шчаслівы той, хто займаецца любімай справай. Можна быць выдатным, дасведчаным доктарам, машыністам, пісьменнікам або грузчыкам, але, калі ў вас злое сэрца, калі вы зайздросныя, эгаістычныя, вы нікому не прынесяце радасці сваёй працай. Таму перш за ўсё трэба быць добрым і спагадлівым чалавекам *(Паводле інтэрнэт-рэсурсаў)*.

**49.** Прачытайце табліцу. Раскажыце на яе аснове аб прыметах публіцыстычнага стылю (з якой мэтай і дзе выкарыстоўваецца, асноўныя жанры).

| Стыль | Прыметы стылю | | |
|---|---|---|---|
| | з якой мэтай выкарыстоўваецца | дзе выкарыстоўваецца | жанры |
| Публіцыстычны | уздзейнічаць на думкі і пачуцці людзей | у газетах, часопісах, радыё- і тэлеперадачах | выступленне; артыкул, нататка*, інтэрв'ю |

**50.** Прачытайце тэкст. Абгрунтуйце яго прыналежнасць да публіцыстычнага стылю.

Штогод у першую нядзелю кастрычніка ўшаноўваюць настаўнікаў. Кажуць, што сапраўдны настаўнік — гэта чалавек ад Бога, а ўсе іншыя прафесіі — ад настаўніка. Толькі чалавеку з асаблівым талентам хопіць мужнасці і цярпення ўзяць на сябе адказнасць за выхаванне новага пакалення. Таму прафесійнае свята педагогаў заўсёды праходзіць цікава, узнёсла і адкрыта. Менавіта настаўнікам адрасуюцца словы шчырай падзякі за талент[л], мудрасць, імкненне аддаць вучням цеплыню сваёй душы, часцінку свайго сэрца... *(Паводле І. Лубнеўскага)*.



Правообладатель Национальный институт образования

**51.** Прачытайце ўслых словы. Растлумачце іх напісанне. Спішыце гэтыя словы, дапоўніўшы рады 2-3 уласнымі прыкладамі на гэтае правіла.

1. Разумны, сардэчны, … .
2. Жыццё, выхаванне, … .
3. Настаўнік, заўсёды, быў, … .
4. Падзяка, дзякуючы, … .

**52.** Прачытайце два віншаванні. Як вы думаеце, хто іх адрасат і адрасант? Якія часткі ў іх можна выдзеліць?

| | |
|---|---|
| адрасант | той, хто піша (гаворыць) |
| адрасат | той, хто атрымлівае (слухае) |

**I.** Вы, як другая маці, ведзяце нас у дарослае жыццё, даяце нам веды, якія дапамогуць нам жыць і працаваць для сябе і ўсёй краіны. Шчыры дзякуй Вам за разуменне, цярпенне, мудрасць. Жадаем Вам здароўя, дабрабыту, старанных і таленавітых вучняў.

**II.** У твой дзень нараджэння, у гэтае светлае свята, я больш за ўсё жадаю табе заўсёды заставацца такой жа вясёлай, прыгожай і шчаслівай, бо ты для мяне самая родная. Я жадаю табе добрага здароўя, сіл і натхнення. Ты для мяне ва ўсім прыклад, ты самая клапатлівая і пяшчотная. Я вельмі люблю цябе. Будзь шчаслівая!

***Звярніце ўвагу!***

Віншаванні звычайна складаюцца з некалькіх частак:

1) прывітальная формула (зварот, прывітанне): *Паважаны (-ая, -ыя) …; Дарагі (-ая, -ія) …; Шаноўны (-ая, -ыя) …* і г. д.;

2) віншаванне: *Шчыра (сардэчна) віншую (-ем) з …; Прыміце нашы шчырыя віншаванні з нагоды …* і г. д.;

3) пажаданні: *Найлепшыя святочныя пажаданні! Самыя лепшыя пажаданні здароўя, настрою, плёну! Шчаслівага свята! Ад усёй душы жадаю здароўя, дабрабыту і здзяйснення ўсіх жаданняў. Хай заўсёды будзе добрым Ваш шлях!*;

4) падзяка: *Шчыры дзякуй за разуменне, цярпенне, мудрасць*;

5) подпіс.

**53.** Падрыхтуйце тэкст віншавальнай паштоўкі з днём нараджэння (для маці, бацькі, бабулі, дзядулі, сябра ці сяброўкі, сваяка, настаўніка і інш.).


Правообладатель Национальный институт образования